№ 19 (135). Вільня, 25 Верасьня 1938 г. Год X.

Шлях Моладзі

Šlach Moładzi

ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ



Biełaruskaje škoInictva — najvialikšaj patrebaj našaha kraju

Presavaja kanferencyja ŭ Vilenskaj Skol. Kuratoryi

U suviazi z pačatkam školnaha 1938-39 hodu, 7.IX u Vilenskaj Školnaj Kuratoryi adbyłasia presavaja kanferencyja. Pradstaŭnikoŭ polskich, biełaruskich, litoŭskich i žydoŭskich hazetaŭ i časapisaŭ haścinna pryjmaŭ p. Kuratar Godecki, katory ŭ svaim referacie padaŭ šmat cikavych viestak ab školnictvie vilenskaha vokruhu, jaki abyjmaje vilenskaje, navahradzkaje i biełastockaje vajavodztvy.

Pryjemna było pačuć, što lik školaŭ pastupova pavialičvajecca, što sioleta vybudavana až 170 novych škol. budynkaŭ, a taksama, što sioleta Vil. Kuratoryja atrymała na 246 etataŭ bolš, čymsia ŭ minułym hodzie. Usich-ža vučycielskich etataŭ u biahučym hodzie pačatkavaje školnictva maje 6486. Imkniecca tak-ža Kuratoryja da taho, kab było bolš pačatkavych školaŭ vyšejšaje stupieni.

Usio heta dobra. I narod, sialanie ŭ budaŭnictvie školnictva pamahajuć jak tolki mohuć. Adnak školaŭ zamała. Da školaŭ zapisana dziaciej nia poŭnych 86 pracentaŭ, pry tym na vioscy, asabliva ŭvosieni byvaje tak što ŭ školu chodzić tolki 25 pracentaŭ. Znača ahramadny lik moładzi astajecca biez aśviety. U siarednich školach pierapaŭnieńnie. Najciažej-ža da ich dastacca moładzi z vioski. Bo sialanie najhorš stajać pad uzhladam hrašovym, a ŭsie siarednija školy znachodziacca ŭ bolšych miestach.

Sprava biełaruskich školaŭ

Spravy školnictva h. zv. nacyjanalnych mienšaściaŭ, a pierad usim spravy školnictva biełaruskaha p. Kuratar u svaim referacie, na ździŭleńnie zaprošanych biełarusaŭ, zusim nie zakranuŭ. Vylezła adnak jana, jak šyła z miaška, zaraz-ža ŭ dyskusii. Biełaruskija pradstaŭniki pastavili nastupnyja pytańni:

1. Jak staić sprava biełaruskaha školnictva na abšary vokruhu?

2. Što stałasia z deklaracyjami, jakija byli padadzienyja biełarusami padčas školnaha plebiscytu ŭ 1936 h.?

3. Jak staić sprava navučańnia biełaruskaha jazyka ŭ školach, u jakich vučacca budučyja vučyciali, heta zn. ŭ licejach i pedagogijach?

Adkazvaŭ na hetyja pytańni p. načalnik Grygleŭski, katory zajaviŭ, što najvialikšaje nasileńnie damahańniaŭ biełaruskich pačatkavych školaŭ było ŭ 1927, 28 i 29 h. Ale nasileńnie heta, kazaŭ p. načalnik, nie zaŭsiody byccam vypłyvała z śviedamaj voli samych baćkoŭ, a było nakidana zhary (treba razumieć — biełaruskaj intelihiencyjaj). Ad 1929 h. tyja-ž baćki byccam što-raz čaściej pačali damahacca pieramieny škoł čysta biełaruskich na dvujazyčnyja, a hetych apošnich — na čysta polskija.

Na pytańnie pastaŭlenaje ŭ mižčasie, jak vyhladaje ličbovy stan pač. biełaruskaha školnictva, adkazvaŭ sam p. Kuratar hetak: ułaściva ŭ viaskovych pačatkavych školach našaha Vokruhu nia možna pravieści razhraničeńnia ŭ płoščy staćciavoj pamiž školnictvam biełaruskim i niebiełaruskim. Tamu bolš racyjanalna jość pravieści płošču padziełu paziomuju (horyzontalnuju), jakaja addziaiła-b u škole nižejšyja addziely ad vyšejšych. Ab charaktary školy rašaje pierad usim nacyjanalnaje pachodžańnie samych dziaciej i tamu z kanieśnaści, kali nie va ŭsich, to ŭ vialikaj bolšaści hetych školaŭ na vioscy ŭ pieršych hadoch vučyciel i dzicia zmušany karystacca biełaruskim jazykom, kab adzin druhoha dobra zrazumieć. U vyšejšych addziełach, u mieru jak dzicia znajomicca z polskim jazykom, sama škoła nabiraje charaktar što-raz bolš polski.

Z adkazu na dalšyja dva pytańni, z jakich apošniaje (3-je) vypłyvała z adkazu na pytańnie pieršaje, prysutnyja zrazumieli, što da Kuratoryi zusim nie dajšli deklaracyi na biełaruskuju školu, padavanyja ŭ 1936 h.; zatoje dachodzili prośby (padańni), katorych adnak tak sama nia možna było zdavolić, bo za raz damahalisia i pačatkavych škoł, i siarednich i navat vyšejšych, dy časta byccam byli padpisanyja moładździu.

Urešcie prysutnyja daviedalisia, što ministerjalnaja prahrama licejaŭ i pedagogijaŭ nie pradbačyć biełaruskaha jazyka, ale dla Vilenskaha Vokruhu sprava heta jšče nia vyrašana i ŭ chutkim časie z miascovaje Kuratoryi majuć być vysłany na zaćvierdžańnie ŭ Ministerstva adpaviednyja prapanovy.

Z hetaha vidać, što sprava biełaruskaha školnictva pradstaŭlajecca davoli sumna. Niekatoryja-ž ćvierdžańni patrabujuć hłybiejšaha daśledavańnia.

Ci biełarusy chočuć biełaruskich školaŭ?

Voś-ža pierad usim, jak skazaŭ p. načalnik Grygleŭski, najbolš damahańniaŭ biełaruskich školaŭ było ŭ 1927, 1928 i 1929 hadoch. Tak. U hetym časie, jak śćvierdžana na sudovaj raspravie red. J. Paźniaka ŭ Vil. Akr. Sudzie 30.XII.37.

biełarusy ŭ Polskim Haspadarstvie padali školnym uładam deklaracyjaŭ na 1.129 biełaruskich škołaŭ. Na kožnuju školu treba najmienš 40 dziaciej, a znača treba bolš-mienš kab na adnu školu padpisali deklaracyi 40 baćkoŭ. Takim čynam deklaracyi na bieł. školu padali prybliznaj 45.160 baćkoŭ. — Ci-ž možna sabie pradstavić, kab usim hetym baćkom, raskinutym pa celym kraju, žadańnie biełaruskaj škoły było „nakinuta", pry skromnym liku bieł. intelihiencyi, jakaja znachodzicca pieravažna ŭ ciažkim pałažeńni, nia moža sabie pazvolić navat na karotkija padarožy, dy jašče tady, kali biełarusy nia mieli nivodnaje arhanizacyi, jakaja abchapiła-b usie bieł. masy („Hramada" była ŭžo źlikvidavana). — Ćvierdžańnie p. nač. Grygleŭskaha ab nakinutaj voli nia vytrymlivaje krytyki. Upłyvy bieł. intelihiencyi na hetuju spravu ahraničylisia tolki da zaklikaŭ i nieabchodnych infarmacyjaŭ, jak treba damahacca bieł. škoły. Rabiła heta bieł. presa. I rabiła heta imienna ŭ imia taho, ab čym havaryŭ i zaklikaŭ i p. Kuratar Godecki,—kab zmahacca z ciemraj i dapamahčy vyvieści spravu aśviety ŭ našym Kraju na naležnuju darohu. Što paźniejšyja damahańni biełaruskaje škoły byli nia zusim zhodnyja z zakonam ab školnictvie z 1924 h., jakim kirujucca školnyja ŭłady—zusim mahčyma, bo jość trudnaści z paśviedčańniem vojtami deklaracyjaŭ z damahańniem biełaruskich škołaŭ. Adnak i padańni, i navat damahańni moładzi śviedčać, što **Biełaruski Narod razumieje ŭžo patrebu svaje rodnaje biełaruskaje škoły, damahajecca jaje, i žadaje jaje mieć i ciapier.**

Dalej, p. nač. Grygleŭski kazaŭ, što baćki pa 1929 h. damahalisia pieramieny bieł. škołaŭ na dvujazyčnyja, abo čysta polskija. Dapuščajem, što byli i takija vypadki. Ale byli i inšyja vypadki. Naprykład u v. Žabinka, Hłybockaj vołaści. Vypadak hety byŭ apisany ŭ № 16 „Šlachu Moładzi" z 16 X.37. Pazvolim sabie hena apisańnie paŭtaryć. Vypadak vyhladaje hetak: „U vioscy Žabinka da 1936 h. była škoła dvujazyčnaja, h.zn. vučylisia dzietki i pabiełarusku i papolsku. Nie padabałasia adnak biełaruskaja mova ŭ Žabinskaj škole prybłudziŭšamu až z Paznanščy ny „gajovamu" Berlingu i byłomu kiraŭniku Žabinskaj škoły Bahusłaŭskamu. Hetyja panki addaŭna sušyli svaje hałovy, kab vykaranić našu rodnuju movu z Žabinskaj škoły, až i prydumali: namovili ludziej da podpisaŭ niejkaj „papierki", havoračy, što heta „padańnie" da inspektara, kab u Žabincy pabudavali novuju biełaruskuju školu. Ludzi drennaha nie pračuvajučy padpisali, a paśla, kali papytalisia, čamu ŭ škole nia vučać pabiełarusku, dyk adkaz atrymali, što „vy-ž sami padpisali, kab jaje nia było"... Stałasia tady ŭsio zrazumiełym, ale ŭžo było pozna...

Ciapier jznoŭ majem viestki, što baćkoŭ vučniaŭ Biełaruskaje Himnazii adviedvajuć troch čałaviek i pad roznymi pryčynami vymanivajuć ad ich padpisy na niejkich deklaracyjach. I chto viedaje, ci chutka nie źjavicca jakiś „patryjot" pierad uładami z plikaj deklaracyjaŭ i nia skaža, što biełarusy i svaje biełaruskaje himnazii nia chočuć.. — Jasna, što takija deklaracyi falšavali-b sapraŭdnuju volu Biełaruskaha Narodu!

Ab takich „vyčynach" roznych typaŭ, jakija chočuć zdabyć sabie zasłuhi za „kulturtrehierstva", mohuć zusim nia viedać kirujučyja ŭłady. I nie mahčyma ŭładaŭ u hetym abvinavačvać. Ale z „vyčynami" henymi treba zmahacca nia tolki biełarusam, ale i ŭładam, bo takija „vyčyny" robiać škodu nia tolki spravie aśviety, Biełarusam, ale i Rečypaspalitaj. Paśla vykryćcia „vyčynaŭ" paŭstaje niezadavaleńnie, jakoje škodzić suźyćciu hramadzian.

Pan Kuratar kaža, što ŭ mieru patreby biełaruskaja mova ŭžyvajecca i ŭ polskich školach. Dapuścim! Paminiom tak-ža toje, što skaz heny p. Kuratara vielmi charakterny i biełarusaŭ zusim nia ciešyć. — Ale jak-ža budzie karystacca biełaruskaj movaj toj vučyciel, jakoha nia vučyli biełaruskaha jazyka ŭ licejach, pedagogijach? Jak napr. buduć karystacca biełaruskim jazykom vučyciali, katoryja pryjaždžajuć na pasady ŭ vil. vokruh z centru Polščy, z Halicyi i jakich, jak sam p. Kuratar zajaviŭ, u 1937 h pryjechała 240 asob, a sioleta dalejšych 60 asob. Apr.ča taho, ci-ž moža vučyciel biez vyraznaje instrukcyi školnych

---

Dr. Jadviha i Stanisłaŭ Hrynkievičy 12)

Ab škole chatniaje haspadarki dla viaskovych dziaŭčat

Žančyna maje nia tolki radzić dziaciej, ale i tak ich vyhadavać, kab vyraśli z ich zdarovyja na dušy j ciele adzinki. Umovy, ŭ jakich hadujucca dzieci, chatni ład, paradak, rovień maralny baćkoŭ i chatnich, relihijnaść, suadnosiny pamiž baćkami j adnosiny baćkoŭ da dziaciej — heta ŭsieńka mamenty, jakija pakidajuć svoj vialiki śled u dziaciej na ŭsio žyćcio.

Rola žančyny tutaka vahromnistaja. Nažal, žančyny mała dumajuć i rychtujucca, pakul voźmuć na siabie henyja abaviazki žonki haspadyni j maciary. Siańniašni ład chatni, kali jon błahi, nadta ciažka, časta na't zusim niemahčyma papravić biez ahulnaje, šyrokaje reformy našaha nacyjanalna-sacyjanalnaha žyćcia. Pakinuć zusim ničoha nie pieramianiajučy, heta aznačała-b astacca zzadu ad tych narodaŭ, dzie ŭ chatniaj haspadarcy bačym biazupynny postup napierad. Papravić bolš radykalna zmoža tolki novaje pakaleńnie, jakoje samoje budzie mieła lepšaje ŭzhadavańnie. Dyk siańniašnija dziaŭčatki, što za niekalki hadoŭ vyrastuć na žanok, haspadyniaŭ j matak, tak treba hadavać i kiravać, kab jany pačynali svajo žyćcio z bolšaju padrychtoŭkaju j śviedamaściu, čymsia heta było dahetul.

Henuju padrychtoŭku treba pačynać u vieku 14—17 hadoŭ, značycca paśla skančeńnia imi pačatkavaje škoły. Siańnia ŭžo mała dzie sustreniem daŭniejšy durny pahlad na toje, što dziaŭčatam nia treba škoły, što navuka patrebnaja tolki mužčynam, dyj to, kab tolki ŭmieli padpisacca. Pry siańniašnich umovach kožny čym lepš azbrojeny ŭ viedu, tym lepš jamu žyviecca.

Kali hutarka ab dziaŭčatach, dyk jakoju budzie henaja padrychtoŭka, usieńka zaležyć ad roznych umovaŭ. Ci heta buduć niejkija *kursy na vioscy*, tryvajučyja kožny hod pa niekalki tydniaŭ u praciahu adnaho ci paru hadoŭ, ci heta buduć *lekcyi*, kali dziaŭčaty sabiarucca ŭ śviatočny čas, ci mo ŭdasca sarhanizavać u škole adumysłovyja *kursy chatniaje haspadarki*, dyk kažam, što heta sprava zaležnaja ad našych mahčymaściaŭ j ruplivaści baćkoŭ. Meta henych kursaŭ ci škoły adna j taja samaja: *aśvieta, zdaroŭje j dabrabyt haspadarki.*

uładaŭ karystacca naležna biełaruskim jazykom u škole?.. — Chiba što nie, bo budzie bajacca, kab nia ŭbicca ŭ supiarečnaści.

Pišam usio heta nia dziela taho, kab kahoś razdražniać ci pad burać, a dziela taho, kab jašče raz źviarnuć uvahu školnych uładaŭ, što patreba biełaruskich školaŭ jość vialikaja. Biełaruskaja-ž mova ŭ pedahohičnych licejach, pedagogijach pavinna być uviedziena jak najchutčej. Pakul hetaha n·a budzie, analfabetyzm, ciemnata, pavarotnaja chvala analfabetyzmu buduć pavialičvacca. — Školnictva—aśvietnaje pracy ŭ našym krai biez biełaruskaha jazyka, biez biełaruskich padručnikaŭ, knižak prosta nie mahčyma sabie pradstavić. Možna śmieła skazać, što biełaruskaje školnictva źjaŭlajecca najvialikšaj patrebaj našaha kraju. Ćvierdžannie heta nia tolki padtrymlivajuć imknieńni biełaruskaha narodu da biełaruskaje školy, ale taksama ŭzhlady čysta pedahohičnyja, kulturnyja, ekanamičnyja, a tak-ža budučynia polska-biełaruskaha sužyćcia. J. N.



Chto niavučycca pabiełarusku ŭ škole pavinien rabić heta ŭ chacie!..

Нявырашаная міжнародная праблема

(Да справы нацыянальных меншасьцяў)

Праблема нацыянальных меншасьцяў — цэлых недзяржаўных народаў, або іхніх часткаў, што засяляючы ўласную тэрыторыю змушаны жыць пад уладай чужой нацыянальна дзяржавы — ня новая і дасюль ня вырашаная.

Гэтая праблема выступала на міжнародную арэну ўжо ў 1815 г. на г. зв. Венскім Кангрэсе, на якім пастаноўлена арганізаваць міжнародную праўную абарону некаторых народаў пад уладай н-цыянальна чужых для іх дзяржаў. Але гэтая пастанова ня мела практычнага значэньня і асталася толькі тэорэтычным разважаньнем у літаратуры міжнароднага права.

Толькі ў часе Сусьветнай вайны, калі амаль усе паняволеныя народы загаварылі аб самаазначэньні, праблема нацыянальных меншасьцяў узноў сталася актуальнай. Незважаючы на тое, што гэтая вайна закончылася з клічам Вільсона „самаазначэньня народаў", тварцы Вэрсальскага міру „вырашылі" гэтую праблему асобнымі міжнароднымі г. зв. „меншасьцёвымі" дагаворамі, ад даючы многія народы дзяржавам другіх народаў, а надзор выкананьня гэтага „меншасьцёвага" дагавору перадалі Лізе Народаў, якая фактычна зьяўляецца арганізацыяй здаволеных Вэрсальскім мірам гаспадарстваў.

Пад надзорам Лігі Народаў 13 гаспадарстваў забавязалася даць сваім нацыянальным меншасьцям поўную свабоду разьвіцьця іхняй нацыянальнай культуры, свабоду рэлігійную, свабоду ў галіне народнай асьветы, свабоду гаспадарчага разьвіцьця і агулам свабоду поўнага іх разьвіцьця нацыянальнага, культурнага і рэлігійнага. Гэткімі гаспадарствамі зьяўляюцца: Аўстрыя (цяпер забрана Нямеччынай), Альбанія, Баўгарыя, Грэцыя, Эстонія, Югаславія, Латвія, Літва, Польшч, Румынія, Турэччына, Вугоршчына і Чэхаславаччына. У гэтых дзяржавах апынулася 18 г. зв. нацыянальных меншасьцяў — 40 міліёнаў насяленьня, а іменна: Альбанцы, Армяне, Баўгары, Беларусы, Грэкі, Жыды, Вугорцы, Вялікарусы, Немцы, Літоўцы, Палякі, Румыны, Сэрбы, Славакі, Словэнцы, Туркі, Чэхі і Украінцы.

Найболей нац. меншасьцяў дастала Чэхаславаччына — 35 прац. насельніцтва цэлага гаспадарства, Польшч — 31 прац., Румынія — 28, Латвія — 26, Югаславія — 17 і г. д. Але мала хто з гэтых 13 гаспадарстваў зварочваў увагу на міжн. дагаворы і свае забавязаньні адносна нац. меншасьцяў. Праўда, некаторыя з іх упісалі зьмест міжнародных забавязаньняў у свае гаспадарственна-асноўныя законы (констытуцыі), але яны так і асталіся толькі пісанымі артыкуламі закону, бо дасюль у жыцьцё не праведзены.

Што-ж на гэта Ліга Народаў?

Biazumoŭna, najlepš było-b kali-b možna było sarhanizavać školu *chatniaje haspadarki*. Plan hetkaje školy, prykładam, moh-by być voś taki. Dziela školy treba było-b adumysłovuju chatu, kala chaty kab byŭ harod z varyvam, dzie-b dziaŭčaty mieli mahčymaść zaniacca praktyčna harodnictvam. Harod padzialić na zahony, kožnaja dziaŭčyna mieła-b tam svajo miesca, dzie mahła-b pakazacca sa svajeju pracaju.

Varyva z harodu išło-b u kuchniu i stałoŭki školy.

Škoła maje adumysłovuju kiraŭnička, jakoj moža pamahać adna ci niekalki dziaŭčat z kursu. Zaniatki tryvajuć ad 8-aj hadziny da 2-oj pa paŭdni. Adna častka dziaŭčat vučycca varyć i rychtavać abied, inšyja pracujuć u aharodzie, a jašče inšyja zajmajucca chatnimi rabotami—šyćciom, myćciom chuścia.

Pobač z navukaju praktyčnuju, dziaŭčaty samyja kuplajuć pradukty patrebnyja da haspadarki, jakich nia majuć na svaim aharodzie, z metaju abznajomicca z jakaściu praduktaŭ, cenaŭ, vučacca prykładam paznać, ci miasa śviežaje, jakaja častka miasa na što patrebnaja da abiedu i h. d. Dziaŭčata vučacca ŭ škole, jak rychtavać ježu, kab pry najmienšym raschodzie mieła jana najbolšuju adžyŭčuju vartaść. Dziela hetaha treba im abznajomicca z fizyjolohijaju traŭleńnia, sa svomaściami paasobnych składovych častak stravy, sa składam małaka, jajec, miasa, harochu, fasoli, kłustaściaŭ, čym roźniacca paasobnyja kłustaści pamiž saboju, čamu nia ŭsio-roŭna, ci jeść alivu, łoj a masła j smalec i h.d. Vučacca taho, što jeść treba nia tolki dziela taho, što čałaviek hałodny, a što meta ježy heta prydbańnie siły dziela pracy fizyčnaje ci ŭmysłovaje. Vučacca pavažnych adnosinaŭ da vielmi prostych na pahlad staron abaviazkaŭ budučaje haspadyni. Viedajem, što čym skramniejšyja umovy hrašovyja ŭ chacie, tym bolšaje treba ruplivaści j praktyčnaje viedy ab chatniaj haspadarcy, kab niejak źviazać kaniec z kancom. *Škoła ci kursy nia dziela bahatych ludziej, jakija zaŭsiody niejak pražyvuć,* vvručać ich hrošy, a voś *biednym treba ŭsieńka lenš umieć zrabić,* kab žyćcio niejak ładziłaś. Viedajučy dobra, jakaja adžyŭčaja vartaść usich praduktaŭ, lahčej ŭ budučyni tanna prakarmić chatniah. Z henaju metaju dziaŭčaty samyja robiać raskład i jakaść abiedaŭ na cely tydzień. Pobač karysnaści je-

А вось што: Рада Лігі Народаў у верасьні 1920 г. прыняла пастанову, што „Ліга Народаў мусіць здабыць сабе гварантыю, што пастановы аб ахароне нац. меншасьцяў будуць праводзіцца стойка і рашуча“. Але гэта такжа былі толькі словы, бо далей Ліга Народаў у гэтай справе заняла становішча выразнага недацэніваньня праблемы нацыянальных меншасьцяў: яна зачыніла нацыянальным меншасьцям беспасрэдны доступ да гэтага „міжнароднага трыбуналу“ сваей пастановай, што ў Лігу могуць падаваць пэтыцыі ў справе нац. меншасьцяў толькі сувэрэнныя гаспадарствы.

Пасьля гэткай пастановы нац. меншасьці былі агранічаны толькі да падаваньня ў сэкрэтарыят Лігі Народаў сваіх скаргаў, якія пераважна асталіся ў архівах гэтага сэкрэтарыяту зусім неразгляданыя.

Паводле афіцыяльных дадзеных гэныя 18 нац. меншасьцяў ад 1920 да 1936 г. падалі ў Лігу Н. 1233 пэтыцыі, у каторых скаржацца на сваё цяжкае палажэньне і невыкананьне адносна іх міжнародных забавязаньняў. Найбольш пэтыцыяў было з Польшчы, бо аж 155. Другое месца заняла Грэцыя—66, трэцяе Румынія—63, чацьвертае Чэхаславаччына - 60 і г. д. З гэтага ліку найбольш падалі пэтыцыяў Немцы — 104, далей Украінцы—85, Баўгары—65, Вугарцы—49, Альбанцы—36, Жыды—33, Грэкі і Паляκі—па 30, Літоўцы—19, Вялікарусы—14, Армяне—12, Беларусы і Славакі — па 6 і г. д. Карысьці-ж з гэных пэтыцыяў ня было бадай ніякай!

Гэтак прадстаўляецца абарона нац. меншасьцяў у міжнародным масштабе. Нацыянальныя меншасьці змушаны былі такім чынам шукаць іншай формы абароны сваіх правоў. Пачаткі гэтага ўжо відавочныя.

Тое, што дзецца цяпер у Чэхаславаччыне (катора ўсё-ж зьвяртала ўвагу на нац. меншасьці), аб чым піша ўся эўрапэйская прэса, усім дыплёматам зганяе сон з вачэй і трымае ў некалькіх гаспадарствах усе збройныя сілы ў гатоўнасьці на вайну. А гэтая-ж трывога бярэ свой пачатак ад нявырашанай міжнароднай праблемы нацыянальных меншасьцяў.

Я. П—к.

IV-ты Паўночны Кірмаш

у Вільні

Ад 17-га верасьня да 2-га кастрычніка сёлета ў Вільні адбываецца IV-ты Паўночны Кірмаш, які мае наступныя аддзелы: промыслу й гандлю, земляробства, рамясла, гыгіены і здароўя; спэцыяльны аддзел гадаўляны: коні, хатнія птушкі, зьвяраты футраныя. Агулам у кірмашы бярэ ўдзел 250 розных прыватных і гаспадарственных прадпрыемстваў. Найбагацей прадстаўляюцца фірмы з цэнтральнае і заходняе часткі Рэчыпаспалітай... Кірмаш адбываецца на абшары 7 га пры вул. Легіяновай (за Вял.Пагулянкай). Пляц гэты на якім стала маюць адбывацца кірмашы, фактычна знаходзіцца яшчэ ў стадыі прыгатаўляньня і разбудовы.

З прычыны Кірмашу будуць наладжаны ў Вільні „дажынкі“, спэцыяльныя экскурсіі і іншыя імпрэзы. Для прыездных з паза Вільні, хто прад тым выкупіць сабе „Kartu uczestnictwa“, даецца 75 прац. спуску за праезд на чыгунках. „Карта“ гэткая дае права ўходу на сам Кірмаш і каштуе: для Віленшчыны, Ліды і Горадні 1 зл. 40 гр., для рэшты 2 зл. 20 гр. Ластаць „Карты“ можна ў канцэлярыі Кірмашоў: (Wilno, Legionowa 1a) і ўва ўсіх аддзелах бюра падарожаў „Orbis“.

Кожны беларус з паза Вільні, які прыедзе на Кірмаш, ці дзеля іншае справы ў Вільню, павінен разлажыць так час, каб мог адначасна адведаць беларускія інстытуцыі: Бел. Музэй, бел. рэдакцыі, кнігарні, друкарню і інш. Усю беларускую моладзь просім адведваць нашую рэдакцыю — „Шлях Моладзі“: Вільня, Завальная вуліца № 1 кватэра 2.

Грамадзяне! Памятайце аб беларускай моладзі і прысылайце ахвяры на дапамаговы фонд беларускім незаможным а здольным вучням і студэнтам на адрыс: Red. „Šlachu Moładzi“ — Wilno, Zavalnaja vul. 1—2.

Памятуйма, што свая беларуская інтэлігенцыя найлепш дбае аб дабро для свайго Беларускага Народу!

žy, nia mienš važnaju spravaju, jošć, kab jana była smašnaju, kab lohka travilaś.

Haspadynia na najmienšaj haspadarcy pavinna ŭmieć viaści zapiski raschodaŭ, ŭkładać svoj biudžet.

Haspadynia nia tolki rychtuje j varyć stravu, na jaje hałavie ŭsie inšyja chatnija raboty. Dyk dziaŭčatam na kursach treba navučycca kroju j šyćcia chuścia, saročak žanočych i mužčynskich, kaftanoŭ, spadnicaŭ, dziciačaje vopratki. Treba joj umieć złatać, kali niešta padziarecca, treba navučycca rabić škarpetki j pančochi, dalej myćcio, mahlavańnie chuścia i h. d.

U škole praktyčna možna abznajomicca z hygijenaju chatniaha žyćcia, jak i čamu vietryć pamieškańnie, jak trymać u čyścini kuchniu, jak prybrać najpryhažej izbu, jakoje śviatło patrebnaje da pracy, jak pierachovyvać vopratku, chuścio.

Biazumoŭna, źmiest škoły hetkaje nie abmiažoŭvajecca henymi praktyčnymi staronami žyćcia. Treba pašyryć i ŭzbahacić unutranaje žyćcio, śvietapahlad. Dyk uzhadavańnie začapiła-b tady *moralnyja j etyčnyja* starony žyćcia, nia mienš važnyja dziela žančyny, čymsia dziela mužčyny. Žyćcio i vartaść relihii, adnosiny da žyćcia hramadzkaha, adnosiny da muža-čałavieka j hramadzianina, adnosiny da pracy, heta temy, jakija šmat času voźmuć ad učašnikaŭ kursaŭ. Hutarki j dyskusii ab aščadnaści razumnaj i skupaści, padychod da inšych źjaviščaŭ haspadarčych i hramadzkich, usieńka zakraniecca ŭ patrebnaj kolkaści j formie na kursach.

Važnaje pytańnie, ab jakim hetak mała viedaje kožnaja dziaŭčyna — jak hadavać dzicia, jak jaho karmić, treba, kab prynamsia krychu abaznajomilisia jany z pytańniem alkoholizmu, veneryčnych chvarobaŭ, spadkajemstva. Apošniaja sprava natolki važnaja, što biazumoŭna kožnaja žančyna musić viedać, što roznyja błahija nachiły, niekatoryja chvaroby pierachodzić z baćkoŭ na dziaciej. Kali dziaŭčyna vybiraje sabie muža, dyk niachaj nie žaniecca za bahaćciem, a pomnić, što šmat važniejšaju spravaju źjaŭlajecca charaktar, zdaroŭje j mazolnaść budučaha muža. Najbolšaje bahaćcie j pryhožašć nie daduć ščaścia ŭ žyćci, kali muž budzie pjanicaju, chvorym ci ahułam błahim čałaviekam. Adnačasna-ž žančyna, kab nie zabyvałasia, što ad jaje zaležyć, kab svaja chata, žonka, dzieci byli mužu daražejšymi čymsia prynady, što maniać jaho šukać ščaścia pamiž čužymi ludźmi.

З вёскі

Пахіліліся клёны
шляхам на слупы,
вецер слаўся лёнам
на дарожны пыл.

Вузкая палоска
жоўтага аўсу...
А на сэрцы — лоскат,
а на сэрцы — сум.

Можа й там — далёка
спутаеш размах?
Эх ты, мілы сокал,
сьлёзаў ў нас няма!

А мо' паміж клёнаў
выкрасіш зару
радасьці зялёнай
з усіх завярух?

А. Іверс.

* * *

Pad pakacistaj ḫaroju,
na pustynnaj nietry,
dzie piaščynki pieraboram
prabirajuć vietry —

uzrasła tam kučaravaj
postaćciu łazinka;
ḫniecca buraju cḫilava
biednaj siracinkaj.

La jaje kabiercam stała
parastać travička.
Ludzi, znajcie, što ciače tut
blizieńka krynička.

K. Raḫojša.

Восень

Ужо мінула краса.
Ужо ня звоніць каса.
Ня чуваць салаўёў.
Не вяселіць палёў
Сваей песьняй рэзвай жаўронка.

Пуста ўжо сенажаць.
Ужо працоўная раць
Ня ідзе на лугі,
Не стаўляе стагі...
Ня чуваць песьні іхняе звонкай.

У палёх пуста й сум.
Сьціх работнікаў шум.
Ня відаць ні капы, —
Ужо забраны снапы, —
Ня відаць ужо жнеяў, ля жыта.

Толькі зьвісься туман
Над ральлёю палян.
Толькі дождджык імгліць,
Толькі вецер гудзіць
Ды бушуе у полі сярдзіта.

М. Рудко.

СУЧАСНАЯ НЯМЕЧЧЫНА

Нямеччына пасьля далучэньня Аўстрыі сталася найбольшым гаспадарствам Заходняе Эўропы. Сяньня займае яна 555 тысяч квадратных кілёмэтраў, усіх-жа жыхароў мае аж 74 міліёны. Мала таго, граніцы Нямецкага гаспадарства Гітлер хоча яшчэ больш пашырыць. Ён сабірае ўсіх немцаў і ўсе нямецкія тэрыторыі. Перад усім заняў ён Надрэйнскую нэўтральную паласу, пасьля далучыў Аўстрыю, цяпер адбірае Судэцкі Край ад Чэхаславаччыны, каторы гістарычна бяручы ёсьць тэрыторыяй чэскай, а што будзе далей пакажа недалёкая будучыня. Гітлер у сваіх намерах вельмі станоўкі і дзеля таго ягоныя імкненьні трывожаць увесь сьвет. Бо-ж імкнецца Гітлер дастаць так-жа нямецкія калёніі, каторыя Нямеччына страціла ў Сусьветнай Вайне. Агулам пляны нямецкае палітыкі вельмі вялікія. Апрача здабыцьця калёніяў, Гітлер думае пашырыць свае ўплывы на ўсход Эўропы і распраўіцца з камуністамі.

Але ці ўсё гэта ўдасца Нямеччыне правесьці, дык вялікае пытаньне, і без вайны хіба-што не абыйдзецца. Фактычна, калі гэта пішам, мала ўжо не хапае, каб між Нямеччынай і Чэхаславаччынай пачалася крывавая вайна. Гітлер аднак іграе асьцярожна, выкарыстывае адпаведныя мамэнты, страшыць і відаць, што вайны і сам баіцца, бо няведама чым-бы яна кончылася. Немцы, хаця ўжо ўзброіліся, і на захадзе ад Францыі будуюць аграмадныя крэпасьці — эканамічна слабыя.

У сучаснай Нямеччыне ўведзена ўжо на прадукты картачная сыстэма. Усё пад кантроляй і пад выдзелам. Збожа адразу забіраецца ў млыны, меліцца, робяцца там розныя дамешкі і пасьля выдаецца ў пякарні ў запляммбаваных мяшкох. Хлеб пякуць у трох гатунках. І як пішуць газэты, ды расказваюць тыя, што былі ў Нямеччыне, хлеб часта бывае такі, што яго есьці проста немагчыма. Ані мяса, ані масла не дастанеш колькі хочаш, а толькі тую порцыю, каторая прызначаная ўладай.

Знатакі кажуць, што на выпадак вялікае вайны, Нямеччына можа вытрымаць 2—3 месяцы. На далей-жа ня хопіць прадуктаў. На танныя ж мэханічна-прамысловыя нямецкія вырабы няма рынку збыту.

Дзеля ўтрыманьня супакою і парадку гітлераўцы ўсьцяж трымаюць Нямецкі Народ у напружаньні, ці то пад клічам далучэньня Аўстрыі да Нямеччыны, ці йзноў Судэцкага краю, калёніяў, вайны і г. д. Ладзяцца такжа вялікія зьезды, кангрэсы. А каб даць працу безработным, праводзяцца вялікія ўзбраеньнёвыя і інвэстыцыйныя работы, якія часта нават не аплачваюцца.

Апошнімі днямі аднак пішуць газэты, што ў Бэрліне адбываюцца бурныя дэманстрацыі работнікаў, каторых вывозяць да крэпасных работаў на францускую граніцу. Так, быццам, калі з аднае станцыі меўся ад'ехаць цягнік з некалькімі сотнямі работнікаў, за кожным разам калі рушыўся ён у дарогу, работнікі сьцягвалі гамульцы і затрымлівалі яго. Толькі пад стражай гітлераўскіх штурмавікоў, пасьля 2-х-гадзіннага спазьненя, удалося адправіць гэны цягнік. Пасьля ад'езду цягніка жонкі, дзеці, сваякі і знаёмыя вывезеных работнікаў, масава выйшлі на вуліцу кідаючы клічы супроць ураду і дэманстравалі сваю варожасьць. Дайшло пры тым да сутычкі з паліцыяй. Тое самае дзеелася, быццам і на іншых станцыях, дзе так-жа разлягаліся клічы: „Проч з вайною, хочама міру і хлеба!" Далей ужо транспарты адбываюцца або ўночы, або вельмі рана. Сьведчыць гэта, што хоць у гітлераўскіх аддзелах ёсьць ваенныя настроі, то аднак у масах да вайны настроі варожыя. І хоць Гітлер афіцыяльна зьліквідаваў усе апазыцыйныя арганізацыі, то ўсё ж апазыцыя існуе і працуе. Адносіны між Каталіцкім Касьцёлам і гітлероўцамі таксама вельмі напружаныя.

Ня гледзячы на ўсё, з Нямеччынай усе лічацца, бо яна ўсё-ж прадстаўляе сілу, а асабліва дзеля таго, што фактычна і Францыя і Англія ня хочуць дапусьціць да новае вайны, каторая запаліла-б увесь сьвет; у абароне сваіх калёніяў гатовы яны разьлічацца з Нямеччынай коштам іншых гаспадарстваў, нават, як відаць з апошніх вестак, коштам саюзнай Чэхаславаччыны.

З. Б.

Разьвітаньне з дыр. Анцукевічам

На пачатку верасьня сёлета, як мы ўжо пісалі, наступіла раптоўная і неспадзеваная зьмена на становішчы дырэктара Беларускае Гімназіі ў Вільні. — Дасюлешняга дырэктара гэтае адзінае сярэдняе беларускае школы грам. М. Анцукевіча Школьны Куратар перанёс на становішча вучыцеля ў польскую гімназію ў Ломжы... Новым дырэктарам назначаны Б. Кавалевіч.

Мікалай Анцукевіч радзіўся ў 1892 г. паходзіць з сялянскае сям'і з-пад м. Бабруйска, у якім у 1911 г. скончыў гімназію, а пасьля паступіў у Нежынскі Гістарычна-Філёлёгічны Інстытут, каторы з прычыны перарыву ў навуцы кончыў у 1918 г. Дыплёмова-кандыдацкую працу пісаў на тэму: „Гісторыя Тураўска-Пінскага Князьства". Пасьля рэвалюцыі працаваў у Лунінецкай гімназіі. Ад 1928 г. працаваў як вучыцель у польскай гімназіі ў Стоўпцах, а ад 1933 г. быў спачатку вучыцелем у Беларускай Гімназіі ў Вільні, а пасьля назначаны дырэктарам яе. Як пэдагог і дырэктар грам. М. Анцукевіч здабыў сабе сярод вучнёўскае моладзі шырокую сымпатыю. Ён заўсёды быў на сваім месцы. Ён, між іншым, вельмі ўмела, спосабам пэдагогічным, а не паліцыйным, вёў барацьбу з камуністычнай агітацыяй пашыранай і на бел. моладзь, і зусім вызваліў гімназію з кругу палітычных разыгрывак. Дыр. Анцукевіч блізка цікавіўся і апякаваўся беларускімі скаўтамі ў гімназіі. Агулам за часоў дырэктарства грам. М. А., ня гледзячы на цяжкія мамэнты з вонкавых прычын, атмасфэра ў гімназіі ачысьцілася. Ровень-жа навукі падняўся вышэй. Можа толькі замала дыр. Анцукевіч цікавіўся бел. грамадзкімі справамі, і можа замалы крыху між ім і грамадзянствам быў кантакт. Праўда, ёсьць апраўданьне: грам. М. А. быў урадаўцам — гэтага трымаўся і ў вір шырэйшага беларускага грамадзкага жыцьця ня мог кідацца.

Дзеля гэтага і дзіўна і незразумела, чаму ўлады пазбавілі яго кіраўніцтва ў Беларускай Гімназіі, далі ніжэйшае становішча і аж у Ломжы... Гэта яшчэ больш павялічвала жаль бел. вуч. моладзі, якая 20.IX разьвітвалася з сваім дырэктарам, а таксама і ўсіх беларусаў, якія жадаюць грам М. Анцукевічу стойка перанесьці балючы ўдар і вярнуцца да працы ў роднай школе ў лепшых варунках.

Адначасна жадаем так-жа новаму дырэктару грам. Б. Кавалевічу сваей працай здабыць сымпатыю моладзі, грамадзянства, умацоўваць і далей разьвіваць Беларускую Гімназію дзеля барацьбы з цемрай у нашым краі і дзеля дабра Беларускага Народу!...

Я. Н.

Z biełaruskaha žyćcia

ПЕРАСЬЦЯРОГА

бацьком, якіх дзеці вучацца ў Беларускай Гімназіі ў Вільні

Даведваемся, што трох чалавек адведваюць бацькоў вучняў Беларускае Гімназіі і выманіваюць ад іх подпісы на нейкіх дэклярацыях. Вось-жа перасьцерагаем і радзім зварочваць увагу, каб дэклярацыі гэтыя ня выйшлі на некарысьць іхнім-жа дзецям (вучням) і Беларускай Гімназіі, якая цяпер называецца — Беларуская Філія I Ліцэю і Гімназіі ім. Ад. Міцкевіча ў Вільні.

Narada CK-BNA. 18.IX sioleta ŭ Vilni adbyłosia pasiedžańnie Centralnaha Kamitetu BNA (Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia), na jakim abhavarvalisia spravy sučasnaha mižnarodnaha i biełaruskaha palityčnaha pałažeńnia. Jak daviedvajemsia, u chutkim časie BNA maje vydać adpaviedny kamunikat.

Kadry biełaruskaje intelihiencyi pavialičvajucca. Sioleta končyła Vilenski Universytet i atrymała anahdaj dyplom mahistra filozofii z haliny historyi hram-ka Marysia Milučanka—maładaja biełaruska, rodam z pad Baranavič. Tema dyplomovaj pracy hram-ki M. M. była: „Histaryčna haspadarčy narys h. zv. Słonimskaje ekanomii". — Mgr. M. Milučanka, budučy studentkaj, pryjmała dziejny ŭdzieł u biel. žyćci i miž inšym cikaviłasia žyćciom i dziejnaściu bieł. paetki Ciotki. Praca mgr. M. Milučanki p. n. „Hramadzkaja i litaraturnaja dziejnaść Ciotki" drukavałasia ŭ Šlachu Moładzi" i vyjšła ŭ 1936 h. asobnaj knižycaj. Vitajučy Mgr. M. Milučanku na novaj darozie žyćcia, žadajem joj dalej płodnaje pracy na biełaruskaj nivie!...

Biełaruski Muzej u Vilni ŭzbahačvajecca. Biełaruskaje hramadzianstva pamiatuje ab biełaskaj nacyjanalnaj kulturnaj skarbnicy — Biełaruskim Muzei ŭ Vilni i ŭściaž ŭzbahačvaješ jaho svaimi darami. Siarod novych zdabytkaŭ Muzeju treba adznačyć poŭnuju dziavockuju vopratku z vakolic Pružan (dar hrm-ki Laŭkavičanki), dahistaryčnyja vykapni (siarod ich cenny dar mgr. M. Piaciukieviča), manety i inš.

Vystupleńni słaŭnaha biełaruskaha špievaka. Šyroka viedamy słaŭny biełaruski špiavak M. Zabejda-Sumicki, tenar Medyjolanskaj Opery, vystupaŭ u Polskim Radjo ŭ Varšavie: 15-ha, 17-ha (na Ameryku) i 21.IX sioleta. U hetych dvuch apošnich vystupleńniach byli miž inšym prapiajany dźvie biełaruskija pieśni: „Kupalonka" i „Kukavała ziaziulka". Budzie tak-ža piajać naš słaŭny mastak 7 X sioleta.

Z žyćcia biełarusaŭ u Varšavie. Biełaruskaje Aśvietnaje T va ŭ Varšavie dalej hurtuje kala siabie biełarusaŭ, jakich los tudy zakinuŭ i ŭ mieru mahčymaściaŭ ładzić kulturnyja imprezy. Kožnuju badaj subotu arhanizuje viečarynki, katoryja ciešacca papularnaściaj, a ŭ najbližejšym časie maje naładzić biełaruski litaraturny viečar.

Biełaruskija Kalendary na 1939 h. Užo vyjšaŭ z druku i pradajecca *„Biełaruski Kalendar Blok (adryŭny) na 1939 h."* (łacinkaj). Chutka tak-ža vyjdzie *„Беларускі Адрыўны Календар на 1939 г."* (hraždankaj), a taksama *„Беларускі Сялянскі Календар"* (knižka).

Novyja biełaruskija pisulki. U m-cy vieraśni ŭ Vilni pajavilisia novyja i pryhožyja pisulki (paštoŭki) z biełaruskimi nadpisami. Nažal adnak nadpis „Ź mianinnymi pažadańniami", što maje značyć „z imianinnymi pažadańniami" vyklikaje mnoha zaściarohaŭ i nia ŭsim budzie zrazumieły, — heta-ž moža strymlivać pašyreńnie bieł. pisulkaŭ siarod biełaruskaha narodu.

ШТО ЧУВАЦЬ

— Здарэньні ў палітыцы апошнімі днямі разьвіваюцца нябывала скора. У **Польшчы** 13.IX громам праляцела вестка, што Прэзыдэнт Рэчыпаспалітай разьвязаў Сойм і Сэнат. Новыя выбары ў Сойм назначаны на 6 лістапада, а ў Сэнат на 13 лістапада сёл. Разьвязаньне наступіла для ўсіх абсалютна неспадзявана і прадчасна, бо дасюлешні Сойм, згодна з законам, нармальным парадкам мог яшчэ існаваць да 1940 г. Прэзыдэнт, разьвязваючы прадчасна Сойм і Сэнат, падаў прычыны, у якіх сказана, што ад апошніх выбараў у нутраным жыцьці Польшчы адбыліся паважныя зьмены і што дасюлешняе прадстаўніцтва не выявіла фактычных народна грамадзкіх паглядаў. Задачай новага Сойму і Сэнату будзе заняць становішча ў справе выбарнага закону ўгэтыя палаты. Газэты пішуць, што Сойм разьвязаны і дзеля таго, што ў ім меў большасьць палк. Славак, катарага нядаўна выбралі маршалкам Сойму і каторы арганізаваў сярод паслоў апазыцыю да ўраду, імкнучыся да поўнага таталістычнага рэжыму. — Роспуск Сойму і Сэнату агулам спаткаўся з прыхільным водгукам. Да новых выбараў апазыцыя аднак ня рвецца, бо адбудуцца яны паводле старога выбарнага закону, які не дае масам безпасярэднягa ўчасьця ў выстаўляньні кандыдатаў і агулам ёсьць супярэчны з дэмакратычнымі прынцыпамі. — Эндэкі ўжо пастанавілі выбары байкатаваць. Тое самае паводле чутак маюць зрабіць „людоўцы“, ППС і Партыя Працы. На выбары ідзе пакуль-што поўнай параў толькі ОЗоН.

— На міжнароднай арэне ўся ўвага зьвернута на **Чэхаславаччыну. Кітай, Гішпанія, Палестына** зыйшлі на другое месца і барацьба там адбываецца бяз большых зьменаў. Справа Чэхаславаччыны сталася асабліва трывожнай пасьля прамовы Гітлера 12.IX на гітл. кангрэсе ў Нюрнбэрзе, дзе ён заявіў, што не пакіне бяз помачы судэцкіх немцаў у Чэхаславаччыне. У Судэтах зараз-жа пачаліся крывавыя забурэньні і напады гэнляйнаўцаў на чэскую паліцыю і жандармэрыю. Чэхаславацкі ўрад абвесьціў ваеннае палажэньне. Тады Гэнляйн, павадыр судэцкіх немцаў, сарваў перагаворы з чэс. урадам і далей праводзіў яшчэ больш варожую работу Чэхаславаччыне. Бачачы гэта ўрад разьвязаў гэйнляйнаўскую партыю, а самога Гэйнляйна прыказаў арыштаваць, аднак Гэйнляйн уцёк у Нямеччыну і адтуль заклікаў суд. немцаў тварыць ахвотніцкія вайсковыя аддзелы і далучаць Судэты да Нямеччыны. У трывожны гэты час **англійскі** прэм'ер Чэмбэрлен на самалёце паехаў у Нямеччыну асабіста перагаварыцца з Гітлерам, які адразу зажадаў далучыць тыя часткі Чэхаславаччыны, дзе жыве большасьць Немцаў. Чэмбэрлен ня мог сам гэтага рашаць і вярнуўшыся ў Лёндын наладзіў спэцыяльную нараду, у якой прыймалі ўдзел французкія прадстаўнікі: прэм'ер Даляд'е і мін. Боннэ. Пасьля гэтае нарады, пад націскам Англіі і Францыі, Чэхаславаччына згадзілася на рэвізію сваіх граніц, бо французкі і англійскі ўрады, а таксама СССР адмовіліся памагаць бараніць сучаснае граніцы Чэхаславаччыны з Нямеччынай. У гэты мамэнт **Польшч** паставіла дамаганьне далучыць да Польшчы тыя часткі Чэхаславацкае Рэспублікі дзе жывуць палякі, а **Вугрыя** язноў тыя часткі да Вугры, дзе жывуць вугры. Дамаганьні Гітлера, Польшчы і Вугрыі падтрымлівае **італіянскі** дыктатар Мусоліні. У Чэхаславаччыне паўстала вялікае напружаньне і абурэньне. Дасюлешні ўрад Годжы прымушаны быў падацца ў адстаўку. Новы ўрад 21.IX, як кажуць, ваенны, стварыў ген. Сыровы — генэральны інспэктар чэхаславацкае арміі. Чэхаславацкае войска на нямецкай граніцы заняло пазыцыі і гатовае да вайны. 22.IX другі раз адведаў Гітлера англійскі прэм'ер Чэмбэрлен і стараўся яго накланіць да спакойнага разьвязаньня справы Судэтаў, але гутаркі іх не далі ніякага выніку. 23.IX у Чэхаславаччыне абвешчана **агульная мабілізацыя, а С.С.С.Р. заявіла Польшчы,** што калі польскае войска пойдзе на Чэхаславаччыну, дык **Саветы сарвуць з Польшчай дагавор аб ненападаньні.** — У Францыі і Англіі сярод грамадзянства вялікае незадаваленьне, што французкі і ангельскі ўрады ў найцяжэйшы мамэнт пакідаюць Чэхаславаччыну і няведама ці там яшчэ ня будзе зьменаў. — Словам, перажываем нязвычайна **трывожны** час.

jn.



Увосені ўсюды адбываліся вайсковыя манебры, з якіх падаём 1 зьнімку

Яшчэ ў справе паховінаў Д-ра Т. ГРЫБА

У справе выдадзенай у Вільні аднаднёўкі п. н. „Наш Золак“ рэдакцыя наша атрымала ад Пахавальнага Камітэту Д-ра Т. Грыба абшырнае выясьненьне, у каторым, між іншым, сьцьвярджае, што:

1. Большая часьць артыкулаў В. Чарнова ў брашуры „Наш Золак“ не згаджаецца з зьместам ягоных прамоваў, сказаных на паніхідзе і на хаўтурнай Акадэміі, а знача — напісаны дадаткова;

2. Думкі В. Чарнова ў гэтых артыкулах ня маюць і мецьня могуць нічога супольнага ані з думкамі Пахавальнага Камітэту ані з думкамі Беларусаў наагул.

3. За славамі В. Чарнова, як Расейца, крыецца мрыя аб „адзінай неідзялімай“. І трудна з гэтага дзівіцца. Горш толькі, што гэта самая мрыя асьляпіла і рэдактароў „Н. Золака“.

4. Асабістая маемасьць па нябожчыку Д-ру Т. Грыбе, так як яе перадаў загадчык дому, у якім нябожчык астатні час жыў, нікім ня прысвоена і знаходзіцца забясьпечаная ў валаданьні Пахавальнага Камітэту. Аб паперах Т. Грыба пакіненых у Бел. Загр. Архіве Пахав. Камітэт нічога ня ведае, бо ня мае туды доступу.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.



Стараста пазволіў, а камандант забараніў

в. Запольле, Карэліцкае вол., Наваградзкага пав. 19.VIII сёлета, на Спаса, моладзь наша мелася наладзіць беларускае прадстаўленьне. На прадстаўленьне гэта прасілі дазволу ў Наваградзкім Старастве і там пасьля сказалі, што Стараста дазвол даў, але па яго трэба зьвярнуцца ў мясцовы пастарунак паліцыі. Калі аднак зьвярнуліся да паліцыі, дык камандант сказаў, што ён дазволу ня дасьць, — і ня даў; прадстаўленьне-ж не адбылося... Факт гэты сапраўды цяжка зразумець.

Карэліцкі П.

Народ трымаецца свае веры

м. Клецк, Нясьвіжскага пав. На Прачыстую ў Клецку адбыўся вялікі праваслаўны фэст—адпуст, на якім моладзі з акалічных вёсак было як маку. Багаслужэньне адбылося вельмі ўрачыста. Быў так-жа Крыжовы ход. Пасьля ўрачыстасьці ўсе авееныя хрысьціянскім духам, поўныя радасьці разыйшліся да сваіх родных сялібаў. Праваслаўныя беларусы ў нас цьвёрда трымаюцца свае веры.

М. Кал—ша.

Калі-ж будуць беларускія аўдыцыі?

Баранавічы. Радыё-апараты, як у Баранавічах так і ў акалічных вёсках даволі шырака распаўсюджаны. Да гэтае пары найчасьцей аднак слухалі ў насМенск, бо гэта была найбліжэйшая радыё-станцыя і адтуль давалі аўдыцыі (перадачы) пабеларуску— зразумелыя для нашага народу. Ясна, такое зьявішча спатыкалася з супраціўленьнем паліцыі, бо Менская радыё-станцыя пашырала камуністычныя ўплывы. Дзеля барацьбы з ёю выбудавалі радыё-станцыю ў Баранавічах і яна ўжо працуе, але, нажаль, беларускіх аўдыцыяў не дае, хоць усе іх цэлым сэрцам жадаюць. Дзіўна сапраўды, што баранавіцкая радыё-станцыя абсалютна ня дбае аб патрэбах мясцовага беларускага насельніцтва, тымбольш, што калі яна будавалася, дык нават польскія газэты шырока пісалі, што баранавіцкая радыё-станцыя павінна змагацца з камуністычнай рапагандай і карыстацца беларускай мовай. Калі ж тады будуць беларускія аўдыцыі?

Б. радыёабонэнт.

Паштовая скрынка

М. Кал-шы: Падпіску атрымалі. № 5 „Шл. Мол." сканфіскаваны. Карэспанцэнцыю друкуем і просім пісаць часьцей.

С. Рудку: Вершу „На сенакосе" не друкавалі, бо быў за слабы.

А. П. у Літве: За падпіску і добрыя словы шчырая падзяка.

Ул. Сен-ку: Ад Вас належыцца 1 зл. і 50 гр.

Я. Бр-лю: За спазьненьне вельмі перапрашаем, пісьмо аднак будзе.

М. В. у Латвіі: За ўсё дзякуем і чакаем на абяцаны нумар часапісу.

С. Ярыне: Вершы атрымалі, патрабуюць паправак. У меру магчымасьці будзем друкаваць.

Адв. У. Б. у Літве: Кніжкі і пісульку з пажаданьнямі атрымалі. За ўсё шчыра дзякуем.

Карэліцкаму і К. В. у Бар.: Карэспандэнцыі друкуем і просім пісаць часьцей.

K. Rah-šy: Padpiska apłačana za ŭvieś hod. Usie numary vysyłajem. Vieršy budziem drukavać, bo ŭžo pryjšla Vašaja kalejka. List „Ch. D." pieradali. Pryvitańnie!

Inž. V. R. ŭ Čechasłavaččynie: Prośbu spoŭnili, za padpisku dziakujem. Z pryčyn adnak cenzuralnych i niastačy miesca zmušany byli skaracić.

Biblijatekaru ŭ Albertynie: Padpisku za ŭvieś 1938 h. zapłaciŭ praf. N.



Referat ab Skarynie na kanhresie historykaŭ. U kancy m-ca žniŭnia sioł. u Zurich (Švajcaryja)adbyŭsia VIII-my mižnarodny kanhres historykaŭ, na jakim prafesar A. Florovskij z Prahi pračytaŭ, jak pišuć hazety, vielmi cikavy referat ab słaŭnym pieršym biełaruskim drukary dr. Fr. Skarynie i jahonaj dziejnaści siarod Słavian.

155 nacyjanalnaściaŭ žyvie ŭ SSSR. Savieckaja Akademija Navuk daśledziła i apublikavała, što ŭ SSSR žyvie 155 nacyjanalnaściaŭ (narodnaściaŭ), jakija havorać 141 jazykami. Bolšaść z hetych narodaŭ, majuć svajo ŭłasnaje piśmienstva i svaje nacyjanalnyja imknieńni. — Jak bačym, SSSR, padobna jak i carskaja Rasieja, źjaŭlajecca „vastroham narodaŭ", bo mnohija z narodaŭ, katoryja žyvuć u SSSR, jak napr. Biełarusy, Ukraincy, Hruziny, Armianie, Azerbejdžanie i inš. usimi siłami starajucca pazbycca Maskoŭska - rasiejska - kamunistyčnaje apieki i žyć samastojna, stvaryŭšy svajo ŭłasnaje niezaležnaje nacyjanalnaje haspadarstva.

Što dziejecca na śviecie ŭ praciahu 1 hadziny. Anhlijskija statystyki abličyli i padajuć, što ŭ praciahu 1 hadziny na ŭsiej ziamnoj kuli: — rodzicca 5400 asob, a pamiraje 4600. U hetym-ža časie sudy zasudžvajuć 198000 roznych prastupnikaŭ na roznyja kary. Ludzi spažyvajuć za hadzinu: 25 miljonaŭ klh. bulby, 10 mil. klh. harodniny, 3,5 mil. klh. miasa, 3 mil., jajok, 3 mil. ryby, 30 mil. klh. cukru. Fabryki-ž robiać 180.000 tonaŭ cyharaŭ i papiarosaŭ, 7,500 novych samachodaŭ. Telehraf pierasyłaje 115.000 telehramaŭ, a pošta pryjmaje bolš milijarda piśmaŭ i pisulkaŭ.

Novy rekord jazdy na samachodzie. Anhlijski spartoviec John Cobb ustanaviŭ nadoviačy ŭ Amerycy novy rekord jazdy na samachodzie. Jon asiahnuŭ sapraŭdy nia bywałuju skorašć, bo až 563,471 kilametraŭ na hadzinu.

S. Kr-vini: Karespandencyju nadrukujem, vieršy słabyja. Padpiska apłačana za cełу hod. Achviaru na muzej pieradamo. Za ŭsio padziaka.

Saju B.. Časapis Vam nia strymany, damahajciesia na pošcie, bo vysyłajecca zaŭsiody akuratna.

Al. Bag-ku: Vysyłajem i čakajem zapłaty.

B. Žoł-skamu: Hrošy atrymali, časapis vysyłajem akuratna. Brakujučyja numary vysyłajem paŭtorna. Pilnujcie na pošcie.

„Шлях Моладзі" рэдагуе Рэдакцыйная Калегія. Друкуецца ў Беларускай Друкарні ім. Фр. Скарыны ў Вільні (Завальная 1-2) коштам працы: Я. Багдановіча, Я. Найдзюка і А. Шутовіча.

Адрыс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца № 1—2 (Wilno, Zawalna 1—2).

„ШЛЯХ МОЛАДЗІ" выходзіць два разы ў месяц: 5 і 25. Падпіска на год 2 зл. і 50 гр., на паўгода 1 зл. 50 гр., на 3 мес.—75 гр. Цана аднаго экзэмпляра 15 грошаў. — Заграніцу ўдвая даражэй. — Нумар каэтатэкі „przekazu rozrachunkowego" 59.

Рэдактар: Я. НАЙДЗЮК.

Выдавец: „БЕЛПРЭС".